Радыё Свабода

**СУД**

# На два тыдні арышту асудзілі высокакваліфікаванага мэдыка, траўмаванага падчас акцыі ў Магілёве

02 кастрычнік 2020, 14:07

Радыё Свабода

**У Магілёве на 14 дзён адміністрацыйнага арышту асудзілі Андрэя Вярбіцкага, якога 27 верасьня траўмавалі падчас разгону шэсьця прыхільнікаў пераменаў. Тады ж яго і затрымалі.**

Судзьдзя Ленінскага суду **Натальля Панасенка** прызнала **Андрэя Вярбіцкага** вінаватым у актыўным удзеле ў «несанкцыянаваным мерапрыемстве». Ён ішоў у калёне пратэстоўцаў, якія выгуквалі лёзунгі, несьлі апазыцыйную сымболіку, чым выказвалі незадаволенасьць вынікамі выбараў.

У агучаных ёю матэрыялах справы згадкі пра нанесеныя абвінавачанаму пашкоджаньні не было. Сваёй віны Андрэй Вярбіцкі не прызнаў, але даваць тлумачэньні адмовіўся.

Супрацоўнік Ленінскага аддзелу міліцыі **Дзьмітры Гоманаў**, які быў сьведкай на працэсе, казаў, што бачыў акрываўлены твар Вярбіцкага, калі яго затрымлівалі. Паводле Гоманава, у міліцыі была інфармацыя, што грамадзяне 27 верасьня выйдуць «на мірны марш» пратэсту. Сам ён быў у «групе інфармаваньня».

Яшчэ адзін сьведка, таксама міліцыянт **Уладзіслаў Шамігаў**, сказаў на судзе, што меўся рабіць відэафіксацыю маршу, але «камэра чамусьці не ўключылася».

Андрэй Вярбіцкі два дні ляжаў у лякарні. Туды даставілі яго зь Ленінскага аддзелу міліцыі. Паўторна затрымалі 29 верасьня, калі паехаў да судмэдэкспэртаў здымаць пабоі. У яго пабіты твар і расьсечаны лоб. Па ягоных словах, гэта зрабілі амапаўцы. Судзілі абвінавачанага праз Skype.

**ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:**

Зь лякарні параненага на нядзельнай акцыі пратэсту магілёўца завезьлі ў ізалятар

Андрэй Вярбіцкі мэдык, рэнтген-лябарант. Падтрымаць яго прыйшлі калегі. Вядома, што абласное ўпраўленьне аховы здароўя высьвятляе ў кіраўніцтва мэдычнай установы, ці зьбіраюцца яго звальняць. Там адмаўляюцца гэта рабіць, бо ён высокакваліфікаваны спэцыяліст.